# «ГІСТАРЫЧНЫ БАГАЖ» НА ВАКЗАЛЕ

**Інтэрактыўная выстаўка пад такой назвай размясцілася ў зале чакання на трэцім паверсе вакзала станцыі «Мінск-Пасажырскі».**

Экспазіцыя прысвечана гісторыі горада-героя Мінска, у тым ліку подзвігу жыхароў сталіцы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, выдатным асобам, помнікам архітэктуры, мемарыяльным комплексам, музеям і г. д. Праект рэалізоўваецца ў рамках Года народнага адзінства.

Стэнды ўладкаваныя ў выглядзе прыадчыненага чамадана, усярэдзіне якога размешчана гістарычная інфармацыя. Цэнтральнае месца экспазіцыі займае інтэрактыўны



дысплэй з картай мясцовасці. Тут жа можна пачуць відэааповед і ўбачыць слайд-шоу з элементамі інфаграфікі, якое складаецца з фатаграфій, у тым ліку архіўных. Можна выбраць па жаданні раздзелы і аб'екты, якія зацікавілі, і атрымаць па іх гістарычную даведку.

Месца размяшчэння экспазіцыі невыпадковае, падкрэслілі ў прэс-цэнтры магістралі. Чыгуначныя дарогі, будаўніцтва якіх пачалося ў XIX стагоддзі, звязваюць рэгіёны і краіны, даюць імпульс іх эканамічнаму і культурнаму развіццю.

«Гістарычны багаж» — гісторыка-асветніцкі праект, мэта якога даступна і цікава расказаць падарожнікам пра гісторыю гарадоў і рэгіёнаў, якія яны наведваюць, акцэнтуючы ўвагу на асобных фактах і сюжэтах.

Праект рэалізоўваецца Расійскім гістарычным таварыствам сумесна з ААТ «Расійскія чыгункі», Інстытутам гісторыі Расійскай акадэміі навук і Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пры падтрымцы Беларускай чыгункі.

Нагадаем, што з ліпеня выстаўка «Гістарычны багаж» дэманструецца на вакзале станцыі «Брэст-Цэнтральны». Яна прысвечана гісторыі гэтага абласнога цэнтра і Брэсцкай крэпасці.

Плануецца, што жыхары і госці Брэста і Мінска змогуць папоўніць свой гістарычны багаж да канца года.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта БЧ.**